№ 43 (492)
Лістапад 2013 года

Краязнаўчая газета

Выдаецца з красавіка 2003 года
www.bfk.by

У нумары:

☞ Спадчына ў небяспецы: дом Героя Сацыялістычнай Працы – стар. 3

☞ Рэгіён: тэлефанізацыя Слоніма ў 1930-х гг. і яўрэйскія могілкі ва Уздзе – стар. 3 і 4

☞ Збіральнік: этнограф П. Шпілеўскі – стар. 6



Лістапад

Скідае лес чароўнасць шатаў,
Ткуць павучкі на іншы лад,
І ўсё бліжэй, шпарчэй, заўзята
Кіруе месяц лістапад.
Стаў па начах туман бадзяцца –
Блукае восень па палях,
Снягі падчас палеткам сняцца,
І вецер шастае ў барах,
Сарваў барвова-залатыя
Кашулі з клёнаў і дубоў,
Кілімам сцеле сцежкі тыя,
Дзе лета бавіла любоў.
Імкнецца ўдалеч ліст апошні,
Яшчэ прывабна-залаты,
Імглой асенняю па пожні
Услед крадуцца халады.

Рэгіна РЭЎТОВІЧ, г. Дзяржынск

Карціна Дзмітрыя САРОКІ «Позняя восень у Вязынцы»

На тым тыдні...

✓ **12 лістапада** ў мінскім Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва адбылося адкрыццё **спецыяльнага праекта Рэспублікі Беларусь «Дэкадзіроўка. Архетып адэкватнага часу»**, прадстаўленага гэтай восенню на 5 Маскоўскім біенале сучаснага мастацтва (пра гэты форум «КГ» пісала раней). Арганізатарамі выступілі музей пры падтрымцы Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь і Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў, спонсар – ААТ «Прыорбанк».

Кожны з аўтараў праекта даследуе тэму (роздум аб камунікацыі ў грамадстве, аб самаідэнтыфікацыі чалавека ў метраполіі, аб захаванні індывідуальнасці ў сучасным свеце) праз скульптурныя аб'екты, інсталяцыі, фатаграфіі.

✓ **14 лістапада** адкрылася мастацкая **выстаўка па выніках 9 пленэру «У пошуках Анлантыды»**, які сёлета ладзіўся ў мястэчку Параф'янава Докшыцкага раёна. Асноўная мэта выстаўкі – пазнаёміць наведнікаў з малавядомымі куточкамі Беларусі, паказаць хараство роднай, і такой рознай, краіны.

✓ **14 лістапада** ў Дзяржаўным літаратурна-мемарыяльным музеі Якуба Коласа стартавала **выстаўка, прысвечаная творчасці Крысціёніса Данелайціса з нагоды 300-годдзя з яго нараджэння і 90-годдзя паэмы Якуба Коласа «Новая зямля»**.

Нягледзечы на 168 гадоў розніцы з Якубам Коласам (К. Данелайціс нарадзіўся 1 студзеня 1714 г. у в. Лаздзіняляй непадалёк Гумбінена, цяпер г. Гусеў Калінінградскай вобл.), у іх творах – паэме «Новая зямля» і паэме «Поры года» (унесеная ў спіс ЮНЕСКА «Шэдэўры еўрапейскай літаратуры») – шмат агульнага. Тут галоўны герой – просты чалавек, паяднаны з прыродай, і не толькі роднага кутка, але і з усім Небам і Зямлёю.

На выстаўцы прадстаўленыя фотаздымкі дакументальных матэрыялаў з Калінінградскага абласнога гісторыка-мастацкага музея (п. Чыстыя Пруды Несцераўскага раёна Калінінградскай вобл.).

✓ **15 лістапада** ў Дзяржаўным літаратурным музеі Янкі Купалы прайшло адкрыццё **выстаўкі «"Я вам прынёс напеў зямлі бацькоўскай..." Ян Райніс і беларуская культура»**. На ёй можна азнаёміцца з жыццём і творчасцю гэтага сусветна вядомага латышскага паэта, перакладчыка, драматурга, філосафа, грамадскага дзеяча, які, як і наш Пясняр, творамі абуджаў нацыянальную самасвядомасць свайго народа, спрыяў фармаванню яго этнічнай самаідэнтыфікацыі.

Выстаўка створаная ў рамках Праграмы супрацоўніцтва паміж Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь і Міністэрствам культуры Латвійскай Рэспублікі на 2013–2015 гг. Пад час адкрыцця прагучалі вершы Янкі Купалы і Яна Райніса на беларускай і латышскай мовах.

Эдуард Пякарскі – беларус у Якуціі

Да 155-годдзя з дня нараджэння

Напрыканцы кастрычніка ў гарадской бібліятэцы Мазыра (філіял № 12) праводзілася літаратурнае падарожжа па жыцці і творчасці нашага земляка, складальніка фундаментальнага слоўніка якуцкай мовы Эдуарда Пякарскага.

Але напачатку спынюся на ягонай біяграфіі.

У адзін пахмурны кастрычніцкі дзень настаяцелю Смілавіцкага парафіяльнага касцёла трэба было ехаць да цяжка хворай пані з суседняга маёнтка. Але нечакана перад касцёлам спынілася брычка. Выйшлі людзі, якія прыехалі з Пятровічаў, каб ахрысціць першынца беднае шляхты – Карла і Тарэзы Пякарскіх. Немаўлятку было два тыдні. Нарадзіўся ён вельмі хваравітым, і таму з хрысцінамі давялося паспяшацца. Незадаволены затрымкаю, ксёндз хуценька адбыў абрад. Арганіст жа ўнёс у метрычную кнігу адпаведны запіс (захаваўся ў фондзе Э. Пякарскага ў Санкт-Пецярбургскім філіяле архіва РАН): «1858 г. кастрычніка 28 дня ў Смілавіцкім касцёле з захаваннем усіх абрадаў таемнасці ахрышчанае дзіця пад імем Эдуард... высакародных Карла і Тарэзы, да замужжа Дамашэвічны, Пякарскіх, законных бацькі і маці сын, народжаны 13 дня гэтага месяца ўвечары ў гэтай жа парафіі ў фальварку Пятровічы».

Адносіліся Пякарскія да старажытнага і даволі вядомага шляхецкага роду. Яшчэ ў XVI ст. продак Станіслаў Роліч прыбыў з нізоў'я ракі Віслы ў Брэст і атрымаў ад вялікага князя літоўскага Жыгімонта II Аўгуста маёнтак Трышына (у наш час вёска Трышына ўвайшла ў межы Брэста, след якой застаўся ў назве Трышынскіх могілак). З часам гэты род увайшоў у гісторыю славянкіх народаў. Адзін з Пякарскіх, Міхайла, у 1620 г. быў пакараны за спробу замаху на польскага караля Жыгімонта III; Пётр стаў акадэмікам, вядомым даследчыкам рускай культуры.

Але паступова шляхецкі род збяднеў. І калі нарадзіўся Эдуард, у 33-гадовага Карла Іванавіча не было, як кажуць, ні кала ні двара. На хлеб зарабляў арандатарствам. А пан патрабаваў, каб фальварак даваў вялікі прыбытак, таму эканом павінен быў выціскаць з сялянаў апошнюю капейку, з другога ж боку, такі прыгнёт выклікаў супраціў сялянаў.

(Заканчэнне на стар. 5)



Прэзентацыя

Легенды і быліцы Нясвіжскага замка

Намеснік старшыні ГА «Беларускі фонд культуры», пісьменнік і грамадскі дзеяч Анатоль Бутэвіч прэзентаваў сваю чарговую кнігу ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь. На гэты раз грамадскасці Мінска ён прадставіў твор, які назваў «Таямніцы Нясвіжскага замка. Падарожжа ўглыб стагоддзяў з Уладзіславам Сыракомлем».

На самой справе, у залах музея адбыўся сапраўдны спектакль з гісторыі славутага горада Нясвіжа і яго гаспадароў Радзівілаў, рэжысёрам і вядучым якога быў сам А. Бутэвіч. На фоне Радзівілаўскай экспазіцыі музея, музыкі і спеваў выбітнага калектыву «Тутэйшая шляхта» Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, пры поўнай зале зацікаўленых гледачоў, там да месца выглядаў столік са шматлікімі кнігамі А. Бутэвіча, выдадзенымі рознымі выдавецтвамі за апошнія гады. Не лішне будзе сказаць, што ўсе яго кнігі сваім зместам даюць магчымасць чытачам шукаць працяг пытанням і нават фантазіям аўтара па той ці іншай тэме гістарычнага даследавання. Аўтар кніг падтрымлівае многія легенды вакол нашых гістарычных месцаў (а часам і стварае іх). Тым самым на базе гістарычных крыніцаў ён адкрывае новыя факты з гісторыі мясцінаў, захапляльныя для чытача (асабліва маладога). Відавочна, аўтар таямніцаў Мірскага і Нясвіжскага замкаў (спадзяюся, будучы аўтар аб таямніцах Гальшанскага замка) паставіў перад сабою задачу замест сухіх і нецікавых па змесце школьных падручнікаў па гісторыі (якіх так не любяць нашыя дзеці) даць у іх рукі кнігі, якія захаплялі б узрушальнай факталагічнай дакументальнасцю, ілюстрацыйнасцю. Таму і яркасць успрыняцця такіх твораў чытачамі любога ўзросту высокая. Гісторыя для школы паводле Бутэвіча – гэта больш пераказ былога, а не навука ў яе класічным разуменні.

Усе прысутныя на прэзентацыі шчыра віталі Анатоля Іванавіча, яго сямейнікаў з незвычайнаю імпрэзай – незвычайнаю па форме, замацаванай жывым словам самога А. Бутэвіча, з дапамогаю музейных спецыялістаў.

А. Бутэвіч з унукамі Колем і Машай пад час прэзентацыі

Пад канец вечарыны – яшчэ адна неспадзяванка: з рэдакцыйнай ўстановы «Выдавецкі Дом “Звязда”» прынеслі на прэзентацыю толькі што выпушчаную з друку новую кнігу А. Бутэвіча – «Паміж Княствам і Каронай» – працяг яго папярэдняга рамана «Каралева не здраджвала каралю».

Таму прэзентацыя завяршылася не толькі апладысментамі, але і тым, што так любіць задаваць А. Бутэвіч, – пытаннем: якімі намаганнямі можна на працягу аднаго года выдаць ажно тры кнігі?

Адказ, разумею, за А. Бутэвічам на наступнай прэзентацыі.

Уладзімір ГІЛЕП,
фота
Наталі КУПРЭВІЧ

Сустрэча ў зале, дзе жыве гісторыя

Міністэрства сувязі Рэспублікі Беларусь

Ф.СП-1

АБАНЕМЕНТ *на газету* 63320 (індэкс выдання)

Краязнаўчая газета

Колькасць камплектаў

на 20__ год па месяцах

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12

Куды (паштовы індэкс) (адрас)

Каму (прозвішча, ініцыялы)

ДАСТАВАЧНАЯ КАРТКА на газету 63320 (індэкс выдання)

ПВ | месца | літар

Краязнаўчая газета

Кошт: падпіскі _____руб.; пераадрасоўкі _____руб. Колькасць камплектаў

на 20__ год па месяцах

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12

Куды (паштовы індэкс) (адрас)

Каму (прозвішча, ініцыялы)

Дзе варта пабываць

Выстаўка з Санкт-Пецярбурга

29 лістапада ў Нацыянальным гістарычным музеі Рэспублікі Беларусь мяркуецца адкрыццё выстаўкі «Белая Русь і яе суседзі». Выстаўка – сумесны праект Расійскага этнаграфічнага музея (Санкт-Пецярбург) і Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь, адмыслова падрыхтаваная да экспанавання ў Мінску і прэзентуецца ўпершыню.

Экспазіцыя складаецца з больш чым 700 аўтэнтычных помнікаў традыцыйнай культуры народаў, якія засялялі землі, што атрымалі назву «Белая Русь». Увазе гледачоў будуць прадстаўленыя традыцыйныя касцюмы, якія найбольш яскрава ствараюць візуальны вобраз народаў гэтага рэгіёну, падкрэсліваюць агульныя рысы і паказваюць своеасаблівасць кожнай з культураў. Адной з цэнтральных тэмаў выступае вясельны комплекс – своеасаблівы этнічны сімвал народаў. Другі комплекс прысвечаны тэме рэлігіі, канфесіям як важнай частцы нацыянальнага адзінства і культурнай разнастайнасці народаў. У экспазіцыі будуць прадстаўленыя матэрыялы, што распавядаюць пра рамесныя традыцыі (ткацтва, дрэваапрацоўку, ганчарства, кавальскую справу). Асобнае месца адведзенае калекцыі ўнікальных музычных інструментаў, якая ў такім аб'ёме экспануецца ўпершыню.

Выстаўка пазнаёміць не толькі з цікавымі матэрыяламі, але і станецца прэзентацыяй аднаго з найбуйнейшых этнаграфічных музеяў Еўропы. Расійскі этнаграфічны музей вядзе сваю гісторыю з 1895 года: знаёміць са спрадвечнай культурай розных народаў Расіі і сумежных з ёю краінаў, іх побытам, традыцыямі, светапоглядам, дазваляе пераканацца ў іх адначасовым падабенстве і самабытнасці.

Выстаўка «Белая Русь і яе суседзі» рыхтуецца пры фінансавай падтрымцы кампаніі Japan Tabacco International у Рэспубліцы Беларусь і СП ЗАТ «Мілавіца».

Паводле інфармацыі арганізатараў

Індывідуальная падпіска — **Індэкс 63320**

1 месяц	15 850 руб.
3 месяцы	47 550 руб.
6 месяцаў	95 100 руб.

Ведамасная падпіска — **Індэкс 633202**

1 месяц	16 196 руб.
3 месяцы	48 588 руб.
6 месяцаў	97 176 руб.

Падпісацца на нашую газету можна з любога месяца. Будзьма разам, сябры!

Спадчына ў небяспецы

Тут жыў...

У рамках дзяржаўнай праграмы навядзення парадку на зямлі штогод у Жлобінскім раёне зносяцца дзясяткі старых і безгаспадарчых дамоў. На жаль, пад агульны грэбень трапляюць і пабудовы, якія маюць пэўную гістарычную каштоўнасць, бо ў іх нарадзіліся і жылі вядомыя людзі. Такі лёс, да прыкладу, нядаўна напаткаў бацькоўскую хату віднага дзяржаўнага і партыйнага дзеяча савецкай дзяржавы А. Грахоўскага (1938–1990), які нарадзіўся ў вёсцы Дуброва Лукскага сельсавета. Верагодна, такое чакае і хату, у якой жыў Герой Сацыялістычнай Працы А. Петухоў (1917–1991), што ў вёсцы Пякалічы Шчадрынскага сельсавета. Таму важна захаваць яе для нашчадкаў хаця б на фотаздымку.

Хто такі А. Петухоў? Чым ён вызначыўся пры жыцці? Аб гэтым раскажам далей.

Пад час правядзення раённых «Дажынак» у вёсцы Шчадрын 3 кастрычніка 2008 года адбылося ўрачыстае адкрыццё плошчы і памятнага знака ў гонар гэтага чалавека – былога кіраўніка мясцовай гаспадаркі Героя Сацыялістычнай Працы Аляксандра Петухова. Адкрываючы мітынг з гэтай нагоды, старшыня Шчадрынскага сельскага Савета Сяргей Тарасаў адзначыў, што Аляксандра Прохаравіча помняць як выдатнага арганізатара сельскагаспадарчай вытворчасці і чулага чалавека, які турбаваўся аб калгасніках. У адкрыцці плошчы і памятнага знака А. Петухову прынялі ўдзел і тыя, хто ў свой час працаваў разам з ім. У іх ліку – удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, ветэран працы Яўген Вісаковіч. Ён паведаміў: «Нашую гаспадарку, калгас імя Варашылава, Аляксандр Прохаравіч узначальваў звыш трыццаці гадоў. Гэта быў патрабавальны, але і справядлівы кіраўнік. Дзякуючы яго намаганням наш калгас стаў адным з лепшых у раёне».

...Нарадзіўся А. Петухоў 22 мая 1917 года ў сялянскай сям'і ў вёсцы Пякалічы цяперашняга Жлобінскага раёна. Усёй душой ён успрыняў перамены ў грамадстве, актыўна ўдзельнічаў у станаўленні калгаснага жыцця. Адным з першых сеў на трактар, потым узначаліў трактарную брыгаду, пазней, як майстар сваёй справы, працаваў раз'язным механікам.

У 1938 годзе Аляксандр Прохаравіч быў прызваны ў рады Чырвонай Арміі. З першых дзён Вялікай Айчыннай вайны апынуўся на фронце. Ваяваў на Калінінскім, Заходнім, Бранскім і 1-м Украінскім франтах. Баявы шлях тэхніка-лейтэнанта 510-га гаўбічнага артылерыйскага палка Краснаярскай 119-й стралковай дывізіі А. Петухова склаў звыш пяці тысячаў кіламетраў і завяршыўся ў Празе. У 1977 годзе ў Жлобінскай раённай газеце «Камуніст» (№ 55) былі надрукаваныя ўспаміны аднапалчанина А. Петухова падпалкоўніка запасу П. Каваленкі, які пісаў: «...29 чэрвеня 1941 года <...> наш полк адправіўся на фронт <...>. У аператыўнай зводцы штаба артылерыі 31 арміі паведамлялася: "За перыяд наступальных баёў з 5 па 15 снежня 1941 года 510-ы гаўбічны артылерыйскі полк <...> знішчыў шэсць гармат, дзве артылерыйскія і шэсць мінамётных батарэй, дзевяць кулямётаў, больш двух батальёнаў гітлераўскай пяхоты"».

За праяўленую мужнасць у час баёў з ворагам А. Петухоў быў узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, Айчыннай вайны II ступені.

На радзіму А. Петухоў вярнуўся ў 1946 годзе, дзе ў якасці кіраўніка ўключыўся ў адраджэнне разбуранага вайною калгаснага жыцця. Асабістым прыкладам у працы ён усяляў у людзей веру ў лепшае заўтра. Гаспадарцы А. Петухова была даручаная дзяржаўная на той час справа – асваенне сельскагаспадарчай культуры коксагыз, якую выкарыстоўвалі пры вырабе гумы. Менавіта за гэта Аляксандру Прохаравічу ў 1952 годзе і было прысвоенае званне Героя Сацыялістычнай Працы.

Мікалай ШУКАНАЎ

На здымку Мікалая СЕМЯНЦА: хата А. Петухова ў Пякалічах (кастрычнік 2013 г.)

Тэлефанізацыя Слоніма ў першай палове 1930-х

Тэлефонная сетка Слоніма ў пачатку 1930-х гадоў дзейнічала ў рамках адной польскай арганізацыі – «Polska Poczta, telegraf i telefon». Хаця сама Слонімская пошта мае даўнія традыцыі. Пра гэта нагадвае і паштовая марка, выпушчаная ў Польшчы ў 1992 годзе. На ёй адлюстраваны герб пошты другой паловы XVIII стагоддзя. Пад княжацкай каронай, на фоне княжацкага плашча знаходзяцца і польскія арлы, і беларуская Пагоня, і надпіс «Stacya Poczthalteryi Slonimska».

У музеі пошты і тэлекамунікацыяў у Вроцлаве на ганаровым месцы стаіць вялікая слонімская паштовая карэта. Захоўваецца там і пячатка слонімскай пошты часоў Міхала Казіміра Агінскага (1738–1800). Тады слонімскім паштмайстрам быў нехта І. Чахоўскі. Амаль праз два стагоддзі пасля Агінскага ў Слоніме з'явіліся тэлефоны. Па спісе абанентаў, які захоўваецца ў музеі ў Вроцлаве, бачна, што ў пачатку 1930-х гадоў у Слоніме налічвалася 190 тэлефонаў – адзін апарат-нумар на 98 жыхароў. Гэта было вельмі мала, бо на той час у Еўропе адзін тэлефонны апарат-нумар быў на 22 чалавекі.

Давайце цяпер паглядзім, хто на пачатку 1930-х гадоў у Слоніме меў тэлефоны. Дарэчы, тэлефоны тады былі падключаныя на наступных вуліцах і завулках (гэта цікава, якія назвы мелі вуліцы і завулкі Слоніма ў першай палове XX стагоддзя): 3 Мая, Глухая, Другая Берагавая, Ружанская, Міцкевіча, Студэнцкая, Касцюшкі, Гандлёвая, Панятоўскага, Віленская, Сянкевіча, Пілсудскага, Замкавая, Бернардынская, Маставая, Магістрацкая, Доўгая, Мяшчанская, Уланская, Агінскага, Жыровіцкая, Школьны двор, Гандлёвы пляц, завулак Аптэчны, завулак Зялёны. У асноўным, тэлефанізацыя была наладжаная ў цэнтры горада. Пошта для сваіх патрэбаў мела 8 тэлефонаў. Дарэчы, тэлефоны пачыналіся з № 0 і да № 189. Калі ў той час нехта набіраў № 0, то мог датэлефанавацца да зменшчыка ў паштова-тэлеграфным аддзяленні Слонім-1 на вуліцы Касцюшкі (стары будынак пошты; цяпер гэта вуліца Маякоўскага), калі нехта набіраў № 4, то мог пазваніць у паштова-тэлеграфнае аддзяленне Слонім-2, якое знаходзілася на чыгуначным вакзале, а паштова-тэлеграфнае аддзяленне Слонім-3 месцілася ў ваенных казармах (туды тэлефон быў з № 1–49).

У пачатку 1930-х тут былі тры аптэкі, дзве бальніцы і прыватныя дактары – Ізаак Эфрас, Моўша Эпштэйн, Хая Якімоўская, Максім Каварскі, Моўша Крэмень, Чэслаў Цяліга, Станіслаў Хшаноўскі, А. Руцкі, а таксама адзін ветэрынар. Кожны з іх меў свой тэлефон. Аптэка «Здароўе» знаходзілася на вуліцы 3 Мая, д.11 (цяпер Чырвонаармейская вуліца). Гарадскі шпіталь знаходзіўся на вуліцы Магістрацкай, дзяржаўны шпіталь на вуліцы Пілсудскага, акушэрская ўстанова на вуліцы Касцюшкі. Ва ўсіх медустановах былі свае тэлефоны.

Тэлефон з № 1 мела следчая ўстанова, тэлефон № 2 – агульная канцылярыя Слонімскага староства, № 3 – мясцовы магістрат, № 5 – пастарунак паліцыі, які знаходзіўся на чыгуначным вакзале, № 6 – натарыус Ціт Салтоўскі, які жыў на вуліцы Касцюшкі, № 7 і (гэта вельмі дзіўна і цікава) меў аптовы склад спіртавой манаполіі на вуліцы Пілсудскага і г.д.

Шмат тэлефонаў мелі два пяхотныя палкі – 79 і 80, якія дыслакаваліся ў той час у Слоніме. Яны размяшчаліся ў казармах, дзе цяпер знаходзіцца Слонімская 11-я механізаваная брыгада на Чырвонаармейскай вуліцы. У вайскоўцаў была свая гарнізонная тэлефонная станцыя, якая абслугоўвала камандзіраў, казармы імя генерала Скерскага, жандармерыю, гарнізонную палату хворых, камендатуру, лясны трэніровачны лагер, прыватныя кватэры генералаў Туркоўскага і Бандроўскага, парахавы склад.

Тэлефоннай сувяззю былі забяспечаныя і банкі з касамі, якіх у Слоніме на той час было нямала. Тэлефоны мелі Народны банк з абмежаванай адказнасцю на вуліцы Касцюшкі, Купецкі кааператыўны банк і Хрысціянскі банк, якія знаходзіліся на вуліцы Міцкевіча, камунальная ашчадная каса, кааператыўная каса, казначэйская ўстанова па справах падаткаў і гербавых зборах.

Паштоўка 1930-х гг.

SŁONIM. Poczta główna.

У першай палове 1930-х гадоў у горадзе былі ажно пяць гасцініцаў з тэлефонамі: «Вікторыя» Жалікоўскага на вуліцы Міцкевіча, 3; «Кракаўская» Равіцкага на вуліцы Замкавай, 8; «Гранд» Мерамінскага на вуліцы Маставой, 40; «Метраполь» Эльясевіча на вуліцы Маставой, 32; «Славянская» Любоўскага на вуліцы Студэнцкай, 3.

Мелі тэлефоны і слонімцы, што займаліся бізнесам. Напрыклад, Лейба Айзенштадт грошы «рабіў» у лясной прамысловасці, Аўраам Парэцкі вырабляў мэблю, Юдэль Паразоўскі на Гандлёвым пляцы (цяпер плошча Леніна) меў уласную друкарню з тэлефонам № 155, прыватная друкарня была і ў Вольфа Раманоўскага на вуліцы Сянкевіча, 5, тартакі мелі на Доўгай вуліцы Файн і Канцапольскі з тэлефонамі №№ 147 і 148 і іншыя.

Мелі тэлефонныя апараты і многія слонімскія магазіны: электрычны, радыётэхнічны, водаправодны, матацыклаў, мэблевы, сельгасмашынаў, будаўнічых матэрыялаў і іншыя.

Тэлефоны ў першай палове 1930-х былі ўстаноўленыя і ў лясніцтвах, дзяржаўнай настаўніцкай семінарыі, якая знаходзілася на вуліцы 3 Мая, 38 (у будынку сённяшняга ліцэя), у Грыбаве ў дзяржаўнай мужчынскай сельскагаспадарчай школе, у павятовай радзе беспартыйнага блока супрацоўніцтва з урадам, у гарадской бойні. Слонімскія графы Уладзіслаў Пуслоўскі, Ксаверы Пуслоўскі, Эмерык Чапскі, Лізавета Моль таксама карысталіся паслугамі тэлефоннай сувязі. Тэлефон меў і ўладальнік прыватнага таксі Мікалай Павук, які жыў на вуліцы Пілсудскага, 53.

Дзе працавалі і чым займаліся тады ў горадзе Рабіновічы, Манусевічы, Мілеры, Лахазвянскія, Гродзенскія і іншыя слонімцы, у якіх дома таксама стаялі тэлефоны, – невядома. Скажу яшчэ, што тэхнікам-наглядчыкам тэлеграфа і тэлефонаў у Слоніме быў беларус Фабіян Якімец.

Сяргей ЧЫТРЫН

Імпрэза

«Пад яснай зарыцай жыццё велічаем»

Сёлета выйшаў дыск «Пад ясну зарыцу (Песенна-абрадавая традыцыя Мёршчыны па матэрыялах аўдыякалекцыі Сяргея Панізьніка. Запіс 1968–1969 гадоў)», выдадзены пры фінансавай падтрымцы суполкі «Пагоня». Падрыхтоўкай яго займаліся спявак, музыка, фалькларыст Сяржук Доўгушаў і дацэнт Таццяна Бярковіч, загадчыца кабінета традыцыйных музычных культураў Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі, дзе і захоўваюцца фальклорныя запісы С. Панізьніка.

Уканцы кастрычніка ў сп. Панізьніка знайшлася магчымасць завітаць у Прагу і прэзентаваць свой дыск у Беларускім клубе на вуліцы 5 кветня. Ён распавёў пра ідэю і гісторыю запісу песень з Бабышак, Даўгінава, Лявонпаля – ад Адэлі і Альжбеты Панізьнікаў, Гені Адамовіч, Зіны Кліманскай, Ліды Шук, Маруты Пальчэх, Ядзвінні і Андрыяна Кісляковў, Вольгі Грэцкай, Марылі Кезік, а таксама ад мамы паэта Ганны Панізьнік.

Сп. Сяргей чытаў свае вершы, напісаныя пад уплывам песень ваколіцаў родных вёскі Бабышкі і мястэчка Лявонпаль, адказваў на пытанні. Госці той сустрэчы пачулі ўсплёскі народнай мудрасці – прымаўкі, павучанні, прыбабунькі, пацешкі, пачутыя ім ад землякоў. З нагоды прэзентацыі С. Доўгушаў выканаў песню з дыска «Хадзіў Раёк...», запісаную 45 гадоў таму ад Маруты Пальчэх з Даўгінава. Да яго далучыўся баяніст і кампазітар Алесь Ясінскі, з якім прадставілі цікавую музычную праграму.

Чарговае прадстаўленне кружэлкі прайшло 17 лістапада ў мінскай галерэі сучаснага мастацтва «Ў». Перад пачаткам імпрэзы гучалі запісы, зробленыя Сяргеем Панізьнікам у 1968–1969 гадах, яшчэ пад час яго службы афіцэрам у войску. Бадай, ніхто тады і не здагадваўся, што праз шмат гадоў песні ягоных родных вёсак яшчэ нямала хто пачуе і палюбіць.

Сустрэча ў Празе

С. Панізьнік (справа) і С. Доўгушаў пад час сустрэчы ў галерэі «Ў»

Фота Уладзіміра ПУЧЫНСКАГА

«Мы – цярплівыя», – зазначыў Сяргей Сцяпанавіч пад час імпрэзы. Сапраўды, мінула чатыры з лішнім дзясяткі гадоў, перш чым знайшліся людзі, якія хай сабе і невялікую частку песеннай спадчыны Мёршчыны здолелі зрабіць вядомай не толькі жыхарам гэтага краю. Ініцыятарам такога праекта стаў саліст гурта «Vuraj» С. Доўгушаў, з якім чытачы нашай газеты добра знаёмыя. Ён распавёў, як шукаў аўтэнтычныя запісы беларускіх песень, каб выдаць іх. А летась яму пашчасціла пазнаёміцца з С. Панізьнікам. Выдатным вынікам таго знаёмства і стаў вышэйзгаданы дыск. Ён быў зроблены пры фінансаванні Андрэя Гайко і мастацкай суполкі «Пагоня», песні падабрала Таццяна Бярковіч, а Таццяна Шчэрбіч стварыла вокладку.

Музычнымі гасцямі імпрэзы былі Раман Яраш і Юлія Літвінава, гурт традыцыйных мужчынскіх спеваў «Кудмень» і, вядома, гурт «Vuraj»; у выкананні апошняга прагучала і адна з песень прадстаўленай на вечарыне кружэлкі – «Раёк».

Трэба спадзявацца, гэтая сустрэча была не апошняй, тым болей што Сяргею Сцяпанавічу яшчэ ёсць чым падзяліцца. «Я вяселле запісаў у Лявонпалі», – адзначыў ён як бы між іншым, так што нагода для наступнай імпрэзы ўжо ёсць.

Уладзімір ПІРОГ,
Ніна КАЗЛЕНЯ

У імя памяці

На ўскраіне Узды знаходзяцца яўрэйскія могілкі. Акурат каля самага ўваходу размешчаны вялікі камень з надпісам, што тут у гады Вялікай Айчыннай вайны расстраляныя і пахаваныя 1 740 яўрэяў, 838 цыганаў, 483 ваеннаслужачыя Чырвонай Арміі і сотні мірных жыхароў іншых нацыянальнасцяў, колькасць якіх не вызначаная. Для нявінных ахвяраў брацкая магіла стала апошнім прытулкам... І па сёння гэтае месца нагадвае пра жудасныя падзеі таго часу, калі многія згубілі сваіх родных і блізкіх, і асабліва пра падзеі крывавай пятніцы 17 кастрычніка 1941 года, калі фашысты знішчылі ўздзенскае гета... У 1947 годзе на месцы расстрэлу быў пастаўлены абеліск, на ім зроблены надпіс (на рускай і яўрэйскай мовах): «Вечная слава павшим от рук немецко-фашистских захватчиков в 1941–1945 гг.».

І хоць з таго часу прайшоў не адзін дзясятак гадоў, сцежка на могілкі не зарасла. Пастаянна тут падтрымліваюць парадак работнікі газавай службы, кааппрама, уздзенскага ўчастка Слуцкага сыраробнага камбіната, камунгаса, СШ № 1 імя А.С. Пушкіна. Адчуваецца ў гэтай высакароднай справе і падтрымка раённага кіраўніцтва: штогод з бюджэту выдзяляюцца грашовыя сродкі на замену старых помнікаў, агароджаў, добраўпарадкаванне месцаў пахаванняў і г.д.

Сёлета сродкі выдзеленыя на рэканструкцыю і добраўпарадкаванне яўрэйскіх могілак. У верасні да гэтых працаў прыступілі работнікі ТАА «Грымуар». Каб даведацца, што і як тут будуць рабіць, мы завіталі на базу гэтага прадпрыемства, дзе пагутарылі з заснавальнікам групы кампаніяў «Каменны Двор» Васілём Лесікам.

– Калі да нас звярнуліся з просьбай аказаць дапамогу, мы выехалі на месца, дзе і вызначылі пэўны шэраг працаў, – расказвае Васіль Аляксандравіч. *– У асноўным гэта працы па дэмантажы і рэканструкцыі існуючых там бетонных модуляў, якія сімвалічна абазначаюць месцы пахаванняў загінулых у гады вайны. Рэканструкцыя плануецца капітальная, звязаная пераважна з жалезабетоннымі працамі.*

Геаметрычнае размяшчэнне модуляў не парушаць, каб захаваць сімвалічнасць, якая, магчыма, была прадугледжаная першапачаткова. Таму ўсё застанецца па-ранейшаму, зменіцца толькі афармленне месцаў пахаванняў.

Працы па абнаўленні сквера не плануюцца, паколькі ён выглядае дагледжаным. Таксама В. Лесік падкрэсліў, што і слядоў на могілках ад правядзення будаўнічых працаў не застанецца, работнікі «Грымуара» пакінуць пасля сябе парадак.

Праверылі спецыялісты і стан галоўнага помніка. Паводле іх словаў, ён замацаваны надзейна. У рамках рэканструкцыі на асноўнай гранітнай стэле будзе толькі адрэстаўраваны тэкст. Замест грунтовага пакрыцця побач з помнікам будзе пакладзеная тратуарная плітка.

– Планавы кошт праекта складае 55 мільёнаў беларускіх рублёў, – працягвае В. Лесік, *– і па дамоўленасці з раённым кіраўніцтвам гэтая сума не будзе перавышана. Курыруе выкананне праекта дырэктар ТАА «Грымуар» Алег Латыш. У яго рэалізацыі задзейнічана брыгада з чатырох чалавек і дзве адзінкі тэхнікі.*

Будаўнічыя працы на могілках былі распланаваныя да 15 лістапада гэтага года.

Камень-напамін

Галоўная стэла на яўрэйскіх могілках

Вера ЛУКАШЭВІЧ
Фота аўтара

Эдуард Пякарскі – беларус у Якуціі

Да 155-годдзя з дня нараджэння

(Заканчэнне. Пачатак на стар. 1)

Дзіцячыя і юнацкія гады Эдуарда прайшлі ў пакутах. Бацьку даводзілася пераязджаць з месца на месца, пастаянна даказваць сваё дваранскае паходжанне (у тыя часы вельмі распаўсюджаная з'ява на нашых землях. – **«КГ»**). Сям'я Пякарскіх належала да таго пласта, з якога выйшлі Кастусь Каліноўскі, Францішак Багушэвіч... Нягледзячы на некаторыя сацыяльныя прывілеі, дробная шляхта жыла збольшага як сяляне. Жонка Тарэза так і не ачомалася ад радзінаў, з-за частых пераездаў шмат хварэла, а неўзабаве памерла. Не дзіва, што К. Пякарскі, пахаваўшы жонку, аддаў сына-першынца на выхаванне ў сям'ю беларускага селяніна.

Родная цётка, якая потым узяла да сябе хлопчыка, жыла ў Мінску ў сціплай хатцы на даходы ад саду і агарода. Вечарамі яна распавядала Эдуарду пра паўстанне 1863 г., пра легендарнага К. Каліноўскага, пра тое, як жорстка ўлады расправіліся з паўстанцамі. Хлопчыка захаплялі гэтыя аповеды пра імкненне да свабоды, барацьбу за шчасце народа, мужнасць. Ён з павагай прыглядаўся да цёткі. Яго здзіўляла, што яна, калі вучыла малітвам, выкідвала з іх прашэнні аб здароўі цара. Але хутка засвоіў, што нельга маліцца за чалавека, слугі якога вешалі паўстанцаў, за адно толькі спачуванне ім высялялі ў Сібір цэлымі вёскамі. Яшчэ цётка навучала Эдуарда рускай і польскай мовам. Доўгімі зімовымі вечарамі ён вучыў на памяць рамантычныя балады і вершы Міцкевіча.

Як толькі падрос, яго аддалі вучыцца ў Мазырскую гімназію, што славілася на ўсю мінскую акругу. На канікулы звычайна ехаў у палескае мястэчка Барбароў, што на Мазыршчыне, да дзеда Рамуальда Пякарскага. Ён доўгі час кіраваў панскім маёнткам Клесін, а потым, назбіраўшы грошай, пабудаваў на панскай зямлі сваю хату. З гадамі рабіўся скупым і дзівакаватым. Тыднямі сядзеў з люлькай у зубах у сваім непрыбраным пакоі, злаваўся, калі хто-небудзь не пагаджаўся з ім. Пры ім змаўкала яго састарэлая пані Валасецкая, якая вяла ўсе яго справы па доме. У дзеда хлопчыку было не лёгка. Сын барбароўскага пісарчука Франц Абрамовіч (пасля вядомы беларускі хірург) успамінаў: «Суседзі і знаёмыя шкадавалі лагоднага, вясёлага і разумнага гімназіста, які будзіў у іх сімпатыю, і пераказвалі недобрыя эпізоды выхаваўчых прыёмаў...».

Таемныя скаргі адчуваюцца ў пісьмах Эдуарда, накіраваныя не толькі бацьку. Вось фрагмент з ліста: *«Больш за ўсё брыдка, што бабуля Валасецкая настойвае, каб тата сам адвозіў мяне ў гімназію. Як яна мне абрыдла, увесь час робячы вымовы, што дзядуля дзеля мяне траціць многа грошай, а на яе – нічога. Адным словам, мне лягчэй заставацца ў Мазыры, чым ехаць ў Барбароў на свята альбо канікулы...».*

Застаючыся ў горадзе, Эдуард падзарабляў на жыццё тым, што дапамагаў рыхтавацца да заняткаў вучням з багатых сем'яў.

Але ў гэты ж час юнак слухаў апавяданні, як жылося раней, як надрываліся сяляне, узводзячы пану Горвату маёнтак, што славіўся на ўсю губерню сваёй раскошаю. У Барбарове мала што змянілася з тых часоў. Асабліва цяжка працавалася наймітам на мясцовых смалакурнях; смалу і дзёгаць гналі ва ўедлівым дыме і цяжкім смуродзе. За працу плацілі вельмі мала.

Э. Пякарскі рана зразумеў, што навокал робіцца вялікая несправядлівасць, што народ пакутуе ад сацыяльнага і нацыянальнага прыгнёту. Але як ваяваць з несправядлівасцю, юнак яшчэ не ведаў. Ён бачыў абмежаванасць правінцыйнага акружэння, марыў вырвацца на шырокія прасторы, дзе жылі і змагаліся мужныя людзі, амаль яго равеснікі...



У 1873 г. Мазырскую гімназію рэарганізавалі ў прагімназію: замест 8-і класаў у ёй стала шэсць. Эдуарду давялося ехаць у іншы горад, з паўгода адвучыўся ў Мінскай гімназіі. Але ў пачатку 1874 г. сюды дайшла вестка, што Таганрогскую гімназію ўзначаліў былы дырэктар Мазырскай гімназіі Эдмонд Рудольфавіч Рэйтлінгер, чалавек даволі кансерватыўны, але справядлівы, таму папулярны сярод вучняў. Юнак перавёўся туды. Пераехалі таксама сын барбароўскага садоўніка Яўген Ёгенсон і іншыя мазырскія сябры. На развітанне Эдуард папрасіў у дзеда на дарогу 50 рублёў, паабяцаўшы, што болей не звернецца да яго па дапамогу.

У Таганрогу ён кватараваў у хаце Паўла Чэхава і сябраваў з яго сынам Антонам.

Потым спрабаваў давучыцца ў гімназіі ў Чарнігаве, але ў лютым 1877 г. пайшоў з яе. Дзед Рамуальд патрабаваў, каб унук прыехаў у Барбароў. З тым, што ўнук кінуў гімназію, дзед змірыўся толькі калі той паабяцаў паступіць у Харкаўскі ветэрынарны інстытут. Тады юнак і заняўся рэвалюцыйнай справай, быў арыштаваны і паводле прысуду высланы ў Якуцію.

Жытло (юрта) Э. Пякарскага ў Якуціі

Працоўны кабінет у юрце

Юнак і яго канваіры ўбачылі ваколіцы Якуцка 2 лістапада 1881 г. Тут Пякарскі павінен быў пражыць шмат гадоў... У 1883 г. ён пабудаваў сабе хату і ўсё вучыўся рабіць сам. За паўгода вывучыў якуцкую мову, якая адносіцца да цюркскіх і даволі цяжкая для навучання. А ў 1898 г. на грошы А. Сібіракова быў выдадзены слоўнік, складзены Пякарскім.

Скончыўся час ссылкі. Эдуард Карлавіч, праз 14 гадоў, збіраўся вярнуцца ў еўрапейскую частку Расіі. У 1900 г. якуцкі ўрач П. Сакольнікаў прапанаваў Э. Пякарскаму скласці кароткі руска-якуцкі слоўнік (які пазней вытрымаў два выданні). Але Пякарскі добра разумеў, што без кансультацыяў спецыялістаў, якія знаходзіліся ў Пецярбургу, праца зацягнецца на доўгія гады. У 1905 г. ён пераязджае ў сталіцу. У Якуціі засталіся сябры, з якімі не парве сувязі да канца жыцця.

За «Слоўнік якуцкай мовы» і першы том «Разнастайнасць народнай літаратуры якутаў» Э. Пякарскага ўзнагародзілі Залатым медалём Рускага геаграфічнага таварыства.

Выключная занятасць не давала Пякарскаму магчымасці наведаць родныя мясціны. Упершыню пасля ссылкі ён прыехаў у Беларусь у маі 1906-га, з'ездзіў у Пінск, сустрэўся з мачыхай і братам ды сястрою.

У 1924 г. Э. Пякарскі зноў надумаў пабываць у Беларусі. Ф. Абрамовічу, сыну былога служачага барбароўскага маёнтка, які стаў вядомым хірургам і працаваў на той час у Мазыры, даслаў ліст з просьбай даведацца, ці мажліва на лета зняць у Барбарове дачу. Абрамовіч з'ездзіў у вёску і адказаў, што там засталіся людзі, якія памятаюць пра ўнука старога Рамуальда – браты Яўген і Якаў Залатарэнкі, былы садоўнік Яўстрат і яго знаёмы Нодэльман. Эдуард Карлавіч узрадаваўся, атрымаўшы такую вестку. Аднак... не змог паехаць з-за занятасці. Праца над асноўнай часткаю слоўніка скончылася толькі ў 1926 г.

За 45 гадоў наш зямляк ажыццявіў навуковы подзвіг. Эдуард Карлавіч стварыў не проста слоўнік якуцкай мовы, а сапраўдную энцыклапедыю ўсяго ладу жыцця народа, яго матэрыяльнай і духоўнай культуры. Заканчэнне працы над слоўнікам было адсвяткаванае грамадскасцю Ленінграда і Якуціі. 1 лютага 1931 г. Э. Пякарскі быў абраны ганаровым членам АН СССР.

Калі ў Мазыры было ўсесаюзнае будаўніцтва нафтаперапрацоўчага завода, з канцэртамі ў горад прыязджалі многія вядомыя артысты эстрады. А адзін з іх сам напрасіўся на гастролі ў Мазыр. Гэта быў Кала Бельды, найбольш вядомы па песні «Увезу тебя я в тундру». Ён пахадзіў па горадзе, з'ездзіў у Барбароў, каб паглядзець дзе рос і вучыўся герой Якуціі, сфатаграфаваў мясціны, родныя якуцкаму настаўніку і вучонаму.

29 чэрвеня 1934 г. Э. Пякарскі памёр. Пахаваны на каталіцкіх могілках у Санкт-Пецярбургу.

Урад Якуцкай АССР увекавечыў памяць навукоўца, заснаваўшы дзве імянныя стыпендыі. Цэнтральны праспект у Якуцку носіць яго імя. А Беларусь засталася ўбаку.

У Э. Пякарскага – дзве радзімы. Першая, Беларусь, яго ўзрасціла. Другая, Якуція, прыгрэла ў цяжкія часы жыцця. Не маючы магчымасці працаваць на першую, гэты мужны чалавек прысвяціў другой радзіме дзясяткі гадоў нястомнае працы.

Мужчынская гімназія ў Мазыры (пач. XX ст.)

Вучні Мазырскай гімназіі імя Янкі Купалы, якія прыйшлі на вышэйназваную вечарыну, слухалі і глядзелі ў поўнай цішыні. А потым пачалі задаваць пытанні пра яго сям'ю, дзяцей. Дзе яны? Што з імі? Хто жонка?

Але такіх звестак у нас няма. Бібліятэкар гімназіі Алена Мазуркевіч і настаўнікі зазначылі, што кожны можа паспрабаваць знайсці многія адказы сваімі даследаваннямі. А бібліятэка для пачатку прапануе кнігу Валянціна Грыцкевіча «Эдуард Пякарскі: біяграфічны нарыс», што выйшла ў 1989 г. у выдавецтве «Полымя».

Ганна БУЛАШ,
бібліятэкар філіяла № 12
Мазырскай гарадской бібліятэкі

Наш каляндар

Зямля і паданні Шпілеўскага

На Любаншчыне яшчэ з дзесяцігоддзе таму праходзіла незвычайная святочная дзея. Паважная грамада тут ладзіла фальклорныя вандроўкі на вазах. Пад час імправізаванага марафону яны імкнуліся ахапіць як мага болей навакольных вёсак. Абавязковым прыпынкам былі Шыпілавічы, вёска, дзе ў 1823 годзе нарадзіўся Павел ШПІЛЕЎСКІ – беларускі этнограф, публіцыст і пісьменнік, які адным з першых заявіў аб самабытнасці беларускага этнасу.

Павел Міхайлавіч паходзіў з сям'і святара. Паводле дадзеных за 1843 год, у Шпілеўскіх было сямёра дзяцей. Павел быў трэцім. Дакументы захавалі нават імя няні будучага пісьменніка. Гэта сялянка Слуцкага Траецкага манастыра, якому належала вёска Шыпілавічы, Агата Касьмінава. Яна з пашанай прыгадваецца П. Шпілеўскім як цудоўная апавядальніца. Пачутыя з яе вуснаў казкі, словы, што «*вымаўляюцца нараспеў, працяжна*», засталіся назаўжды ў памяці Паўла.

На будучыя захапленні этнографа паўплывалі і службовыя пераезды бацькі. Як сведчаць гісторыкі, святар М. Шпілеўскі вызначаўся дзёрзкім норавам, не заўсёды выконваў загады кансісторыі, і яго часта пераводзілі на новыя месцы. Хлопчык падарожнічаў разам з сям'ёй, а калі пачаў атрымліваць адукацыю, то вяртаўся ў аддалены павет да бацькоў на канікулы. Яго вабіў свет старых хатак і клецяў, бедных, але добрых людзей з іх «*павольнай, лянівай гаворкай*». Менавіта тады ён пачаў занатоўваць пачутыя ім дзівосы пра знахараў-чарадзеяў, «*пра недаступныя скарбы і пачвар, што іх пільнуюць*»: «*Колькі новага, чаго нельга даведацца за школьнай лаўкай, я спасціг у гэтым народным вучылішчы, багатым разнастайнымі прадметамі і навукамі аб роднай зямлі і мове, аб старажытным жыцці-быцці продкаў, дзядоў, аб пераваротах у розныя эпохі гісторыі Заходняй Русі*».

Акрамя народнага вучылішча П. Шпілеўскі скончыў Мінскую духоўную семінарыю ды Пецярбургскую духоўную акадэмію са званнем кандыдата багаслоўя. Ён вывучаў філасофію, царкоўную і агульную славеснасць, матэматыку, фізіку, царкоўную і агульную гісторыю, яўрэйскую, грэчаскую, лацінскую, нямецкую і французскую мовы.

Багаслоўе так і не сталася прызваннем яго жыцця. Містычнасць і архаічнасць беларускай культуры з яе дахрысціянскімі каранямі прыцягвалі яго больш. Ён заглыбіўся ў міфалогію і фальклор Палесся. П. Шпілеўскі адмовіўся ад духоўнага

сану ды стварыў язычніцкі пантэон у «Белорусских народных поверьях» (1846). Ён апісаў 52 боствы і духі беларускай міфалогіі, паданні, звязаныя з імі, і абрады іх ушанавання, а таксама прымаўкі, у якіх згадваюцца гэтыя персанажы. Цікава, што многія з гэтых персанажаў увайшлі ў сучасны энцыклапедычны слоўнік «Беларуская міфалогія».

Шпілеўскі пакінуў даволі важкую літаратурную спадчыну, але ёсць дзве галоўныя працы, якія атаясамліваюцца з ягоным прозвішчам. «Вандроўка па Палессі і Беларускім краі» і «Белоруссия в характеристических описаниях и фантастических поверьях» – абедзве выйшлі ў 1853 годзе.

Насычаная гістарычнымі і этнаграфічнымі звесткамі «Вандроўка...» – своеасаблівая энцыклапедыя Беларусі першай паловы XIX стагоддзя, якая не мае сабе роўных у дарэвалюцыйнай краязнаўчай літаратуры. П. Шпілеўскі пісаў яе пад час падарожжаў з Варшавы (дзе ён працаваў пасля заканчэння духоўнай акадэміі) на адпачынак да бацькоў. Як слушна заўважыў Г. Кісялёў, які адкрыў чытачам асноўныя біяграфічныя звесткі аб Шпілеўскім: «*Для многіх гэта была ардынарная турботная паездка, для яго – падарожжа, гэта значыць нешта няспешнае, засяроджанае, узнёслае па мэтах і душэўным настроі*».

Калі «Вандроўку...» можна смела назваць энцыклапедыяй краязнаўства Беларусі, то «Белоруссия в характеристических описаниях и фантастических поверьях» – энцыклапедыя беларускага фальклору. Яна складаецца з 17-і артыкулаў, якія з 1853 па 1855 год друкаваліся ў пецярбургскім часопісе «Пантеон». Гэта самае поўнае на той час апісанне каляндарных звычаяў, абрадаў і чарадзейных казак беларусаў.

У энтаграфічных працах Шпілеўскі прыводзіў многа цікавых звестак аб лексічных, фразеалагічных, фанетычных і граматычных асаблівасцях беларускай мовы, выказваў арыгінальныя, хоць і не заўсёды правільныя, думкі аб яе паходжанні, гісторыі і межах тэрытарыяльнага распаўсюджвання, спрабаваў высветліць этымалогію некаторых беларускіх словаў. Беларускай мове ён прысвяціў тры працы – «Словарь белорусского наречия», «Краткую грамматику белорусского наречия» і «Заметки белорусца о белорусском языке», якія не публікаваліся і захоўваюцца ў рукапісным аддзеле Акадэміі навук у Санкт-Пецярбургу.

Падрыхтаваў Ігар МЫСЛІВЕЦ

Пад час свята ў Шыпілавічах (2003 г.)

Ад рэдакцыі. ***І напрыканцы зноў звернемся да свята Шпілеўскага на Любаншчыне. Ягоным ініцыятарам і «маторам» быў знаны сучасны фалькларыст Васіль Ліцьвінка. Прымаў у гэтым свяце актыўны ўдзел і Беларускі фонд культуры. На жаль, са смерцю энтузіяста знікла і свята. Але ж цяперашнія прадаўжальнікі слаўнай спадчыны, мясцовыя ўлады маглі б аднавіць незвычайны фэст. Каб зноў жыхары раёна ды прыезджыя бралі ў рукі кіёчкі, закідвалі ў сумкі лусту хлеба ды кус сала, сядалі на вазы ды ехалі па вёсках, сустракаліся з носьбітамі багатай традыцыі зямлі Шпілеўскага. Думаецца, нямала мог бы дадаць свайго і фалькларыст Сяргей Выскварка, які некалі актыўна браў удзел у імпрэзах В. Ліцьвінкі.***

Алесь ДУДАР

Кастусь Каліноўскі

Беларусі паўстаўшай – слава,
Беларусі – ў пояс паклон.
Хай мінулае цемра заслала –
а змагання не забыць ніколі.

Эх, Кастусь... Балоты памераў,
а ў лясах, як у бацькавай хаце.
Беларусь табе паверыла –
за табою пашла змагацца.

Беларусь – не царам маскоўскім,
Беларусь – не варшаўскім панам!
Зазвінелі ў лесе бярозкі,
дуб стары галаву падняў.

Забуяніла ў полі рэхам:
– За мужычую праўду – у бой!

Не Ілля па хмарах праехаў,
не Пятро зазваніў булавой...

А пасля – вастрожныя краты...
Што з таго, што жыцця не стане.
Твае слёзы важыць на караты:
– Залілі, загасілі паўстанне...

Скалыхнуўся натоўп на Лукішках:
– На Беларусі няма шляхты!..
Можа кат успомніў за кілішкам,
як памёр мяцежнік пракляты.

Маліцца – ня наша справа.
Кастуся мы па-простаму ўспомнім:
Беларусі паўстаўшай – слава,
Беларусі ў пояс паклон.

1925 г.

Раіса БАРАВІКОВА

Кастусь Каліноўскі

Праспявалі салаўі вячэрню.
Ноч маўчыць.
Заблішчыць раса сцяжэлым
зернем на мячы.

Свечак золкай додніцай назаўтра
не палі.
З поту векавой мужыцкай праўды –
соль зямлі.

Да абедні распяюць туманы
салаўі
над праткнёным дзідаю курганам
у баі.

І яшчэ далёка да памоста,
чысты шлях,
і гарыць лязо сякерай гострай,
нібы сцяг.

1981 г.



«Княгіня Б. перадае штандар камандзіру добраахвотнікаў Арленскаму (Мінская губерня)». Гравюра з французскага тыднёвіка «Le Monde»

Традыцыі і сучаснасць

«Святло і цені» лекара ды блазна

Тацяна Беланогая «Святло і цені», Мн., 2013, «БМАgroup»/«Vigma»

Здаецца, беларускі шоўбізнес ў часіны фанаґрафічнага крызісу рызыкуе выпускаць усё карацейшыя альбомы з мінімумам жыццёвага сэнсу ў іх, не задумваючыся, каму будуць прадаваць тое. Вось трэці альбом бард-рок спявачкі Тацяны Беланогай (пра «Дзвюхкроп'е», выдадзенае ў 2007 г., і «Ніткі», што выйшлі ў 2010 г., «Краязнаўчая ґазета» пісала ў № 14 за 2008 г. ды ў № 7 за 2011 г.). Дыск выдадзены аскетычна (чорна-белая гама вокладкі, 37-хвілінная праґрама песень), але шыкоўна (16-старонкавы буклет, усе тэксты на беларускай і англійскай мовах, мультымедыйныя файлы з тымі ж тэкстамі й акордамі). Няма, праўда, фота выканаўцы, затое ёсць каляровае фота дачасна памерлай 33-гадовай перакладчыцы на беларускую мову французскіх успамінаў Міхала Клеафаса Агінскага – Вольгі Рамановіч, якой прысвечаны альбом.

Па шчырасці, вакальны талент спявачкі не стаіць на месцы, імпэтна развіваецца, але ад расчараванняў не ратуе. Асабіста я пачуў гэтае імя ў студыі Андрэя Плясанава пад час падрыхтоўкі бардаўскага праекту «Вольныя песні». Потым былі альбомы з вершамі Наталлі Кучмель, Сяргея Новіка-Пеюна, Наталлі Арсенневай, прыслухоўваліся меламаны і да ўласных Таніных рыфмаў. Але яе пацягнула ў моду паэтычнага аванґарду, падтрыманага й прэсай, і рознымі спонсарамі кшталту «Будзьма», дзе рыфмаў і сэнсу ўсё менш, усё больш шматзначных намёкаў, што, на жаль, працягвае выяўляцца і ў трэцім альбоме:

Музыка. Табе трэба цішыня.
Ты не можаш быць самотнай,
Ты не жалезны кулак.
Музыка. Непрыручаны пясок.
Музыка. Для мяне ты лялька
І вецер,
І імя ў цябе няма.
Музыка. У тваіх жылах дождж.

Ох, калі чуеш чароўны голас і меладычны набор нейкіх зразумелых словаў, дык усё нармальна, здаровы мозґ сам міжволі складзе нейкі сэнс, але бярэш у рукі буклет, і бясэнсавасць выплюхвае шквал пытанняў: калі «музыцы трэба цішыня», дык мо' слушна «шмат разоў забівалі цябе»? І дзе тыя «жылы музыкі», у якіх ідзе дождж? Працягваць можна бясконца... Пазней слухач натыкнецца й на такія дзівосы, як у песні «Там, за акіянам»: «Кожны памірае раз, нарадзіцца трэба – два» (не заменіць такая бухгалтэрыя простую народную мудрасць «два разы не паміраць, аднаго не мінаваць»).

Яшчэ? «Анёлы»: «Белыя анёлы спявалі песні, ірвалі сэрцы, шукалі прыстань» (некуды б адправіць такіх анёлаў); «Распавядзі»: «Распавядзі, на якой мапе сэрцы мае, распавядзі, у якіх далонях жывая памяць мая» (як у дзіцячай загадцы: «навошта лысаму лядоўня, калі ён плаваць не ўмее?»), «Просты музыка мусіць спяваць пра тое, што ён бачыць наўкол» (ці не з вядомага анекдота?); «Крыніца срэбра»: «Крыніца срэбра – нагойная рана, якая заўсёды хоча піць. Крыніца срэбра. Спалн падручнік, у якім цябе няма» (мо' і мне сплесці такія verbалозы «Сэнс хады – вялікі мурог, які заўжды варушыцца, сэнс вады наталяе тварог, калі бялізна сушыцца»); «Кола»: «Я хаджу ды спяваю песні жабракам ды сляпым дзецям, маладым наркаманам ды галодным сіротам» (а гэта многае тлумачыць, толькі на каго пакінутыя старыя наркаманы й відушчыя дзеці?); «Чацвертая сусветная вайна»: «Руды снег падае на чырвоны асфальт, Я зачыняю акно, за якім рознакаляровыя сны, Я зачыняю акно, за якім маё паветра» (бедны Мігель дэ Сервантэс Сааведра, ён думаў, што «немагчыма зачыніць поле брамкаю» – тут ужо вакно зачыняюць ад вайны); «Пакідаеш мяне, але заўжды са мною»: «У гэтым горадзе так шмат новых ідэй. Адныя будуць жыць, а другія – не» (іранізаваць не буду, бо тэма страты балючая й зразумелая, мо' нават песня прысвечаная той самай В. Рамановіч, але наўрад ці шматлікасць ідэй стала прычынай смерці сяброўкі). Цытаваць можна і далей...

Крыху больш зразумелых алюзіяў у песні «Мёртвая трава»: «Што такое сэрца? Што такое вера? Што такое сорам, калі я мёртвая трава? Што такое танец? Што такое сонца? Што такое песня, калі я мёртвая сама?» Нібыта празрыста, але... «Прарастае ў горадзе на суседнім доме, прарастае ўнутры ў маім пакоі мая душа». Здаецца, набор слоў можа быць любы, дык хоць бы аўтарка больш дакладныя рыфмы падабрала, а не «трава/сама», «вага/трава», «вечар/вечнасць»...

Каб не здалося вам, што я ўвогуле супярэчнік усяго новага, нестандартнага, мушу прызнацца, што адну песню гэтай праґрамы ўсё ж адклаў на фінальны разбор – «Мама». Увесь гэты дыск мне трапіў у рукі акурат на сарачыны па смерці маёй мамы. І, нягледзячы на тую ж нестрымную плынь свядомасці, твор літаральна крануў да слёз, бо алюзіі ягоныя дакладна адпавядалі тагачасным перажыванням:

Я вады не піла,
таму і кволая я.
Я іду ад відна,
таму стамілася я.
Мама, дзе ты?
Дай напіцца вады.
Мама, мама, дзе ты?
Ўперад звалі дарогі
ды калолі мне ногі.
Калыхалі нябёсы
ды гладзілі косы.
Мама, сагрэй полымем вачэй!
Мама, дзе ты?

Так што мая іронія хай не бянтэжыць ні аўтара, ні тых, каму лягуць на душу творчыя асацыяцыі Тацяны Беланогай. Тым больш, што спявае яна ўсё гэта так, што сумненняў у боскасці таленту ніякіх. Ну але геніюшаўскай віртуознасці ад Боскага таленту ўсё ж хацелася б, накшталт стройных і светлых радкоў 1964-га:

На магілах не сеюць пшаніцы,
З чужой крыўды не вырасце доля.
Хто не здольны
прад здзекам спыніцца –
Панаваць той не будзе ніколі.

Паэтычны аванґард – класная рэч, але залішняе паглыбленне ў даўно перажаваную Еўропай плынь дадаізму (калі раманы стваралі адвольнай нарэзкай ґазет, наклееных на аркуш) можа любога прывесці ў татальны айчынны занудзізм, калі паэт не можа здзівіць ні рыфмамі, ні глыбінёй сэнсу, ні яскравасцю метафараў, ні стройнасцю формы, чым поўняцца акурат ва ўсіх не зусім вольных краінах літаратурныя часопісы, песенны радыёэфір, бо ім аднялі права панавання духам. Хай бы ў Беланогай і душа засталася белай, бо хворая Беларусь чакае лекара, а не блазна, каб усміхнуцца жыццю.

Вітаўт МАРТЫНЕНКА,
музычны крытык

Пад час сустрэчы з вучнямі СШ № 1 г. Бярозы

(Працяг. Пачатак у № 42)

« ...На другой день пан гетман, сопровождаемый тысячным отрядом конного рыцарства, приехал к острогу в Клушино: москвитяне выходили из него полками и все до самого по-следнего присягали в верности. Для принятия присяги пан гетман назначили Руцкого, Бобовского, Добромирского и меня четвёртого.

Не мешкая долго в сём месте, мы двинулись к столице: все присягнувшие московитяне и немцы были с нами. Но едва мы отошли несколько миль, как прибежали из Москвы к пану гетману русские с известием, что там царя Василия Шуйского постригли в монахи, родных же братьев его Дмитрия и Ивана содержат под стражею, а нас ожидают с нетерпением, желая возвести на царство королевича Владислава.

В Москве же приводили к присяге бояр и народ русский сановники, избранные боярами, и жолнеры, назначенные паном гетманом. Это продолжалось целые семь недель ежедневно, кроме воскресенья и больших праздников; в иной день присягало по восемь, десять и двенадцать тысяч человек; в одной столице более трёхсот тысяч признали себя подданными королевича; в города же и области Русского государства разосланы были для того бояре. Таким образом, в три месяца вся Московская земля присягнула королевичу, исключая Смоленска и тех городов, которые Понтус Делагарди (чалец нямецкіх наймітаў у войску Д. Шуйскага. – **М.Г.**) *держал в осаде и в последствии овладел ими, а именно: Новогорода, Пскова и других, им прилежащих...*

Бывший царь, Шуйский, находившийся под стражею в одном монастыре в столице, отвезён с обоими братьями к Троице. К королю отправлены послами от Московского государства Василий Голицын, Сукин и бывший патриарх Филарет. Пан гетман также уехал к королю, поручив войско Александру Гонсевскому. Он взял с собою трёх Шуйских, царя и двух братьев его, и отдал их королю под Смоленском, как пленников.

Московитяне уже в начале октября (1610 г.) начали прискивать все способы, как бы выжить нас из столицы.



Заёмнае пісьмо Ілжэдзмітрыя Юрыю Мнішаку на 3 тыс. злотых

Для лучшего в замысле успеха и для скорейшего вооружения русских, патриарх Московский тайно разослал по всем городам грамоты, которыми, разрешая народ от присяги королевичу, тщательно убеждал соединёнными силами как можно скорее спешить к Москве, не жалея ни жизни, ни имуществ для защиты Христианской веры и для одоления неприятеля. "Враги уже почти в руках наших, – писал патриарх, – когда же ссадим их с шеи и освободим государство от ига, тогда кровь христианская престанет литься, и мы, свободно избрав себе царя от рода Русского, с уверенностью в ненарушимости веры православной, служащей оплотом нашему государству, не примем царя Латинского, коего навязывают нам силою и который влечёт за собою гибель нашей стране и народу, разорение храмам и пагубу вере христианской"»...

(Працяг на стар. 8)

(Працяг. Пачатак на стар. 7)

1611 год. К Рождеству Христову бывает в Москве великое стечение народа, а к Крещенью ещё более: со всего государства съезжаются бояре для торжественного обряда, совершаемого самим патриархом на реке Москве. Пользуясь этим съездом, московитяне замышляли против нас измену; наши остереглись и уже не отрядами, а целым войском держали стражу, готовясь к отпору, как бы в военное время; от Рождества до самого Крещенья, доколе не разъехались московитяне, мы не расседлывали коней ни днём, ни ночью. Все мы утомлялись частыми тревогами, которые бывали по 4 и по 5 раз в день, и непрестанною обязанностью стоять по очереди в зимнее время на страже: караулы надлежало увеличить, войско же было малочисленно.

Предосторожности наши были, однако, напрасны: мятеж разразился громом, и немногие могли предугадать его…».

Жыхары Масквы, абмануўшыся ў сваіх надзеях, вырашылі выгнаць іншаземцаў і на заклік патрыярха Гермагена пайшлі на палякаў. Маскевіч паспеў закрыцца ў Крамлі разам з атрадам Гансеўскага, паліў і руйнаваў сталіцу, змагаўся з Ляпуновым і Трубяцкім, неаднаразова выходзіў на разведку з Хадкеічам. Калі Самуэль зразумеў, што палякам не ўтрымаць Расію, вярнуўся на Бацькаўшчыну перад паўстаннем Мініна і Пажарскага.

У Польшчы ён прыстаў да канфедэратаў, патрабаваў ад караля платы за маскоўскі паход і збройна забіраў даходы з каралеўскіх маёнткаў. Калі атрымаў усё, што хацеў, закончыў сваю дзейнасць у званні палкоўніка.

Маскевіч быў знаёмы з галоўнымі ўдзельнікамі кампаніі 1602–1612 гг.: Ілжэдзмітрыем Першым і Другім, з Марынай Мнішак і яе бацькам, каралеўскімі асобамі, военачальнікамі Расіі і Польшчы.

Нацыянальным героем Расіі стаў кастрамскі селянін Іван Сусанін, які цаной свайго жыцця загубіў польскі атрад. Магчыма, аб гэтым у сваім «Дыярыушы» апісвае Маскевіч: *«Тут, в деревне Вишенце, мы поймали старого крестьянина и*

С. Іваноў, «У Смутныя часы»

взяли его проводником, чтобы не заблудиться и не набресть на Волок, где стоял сильный неприятель. Он вёл нас в одной миле от Волока, ночью же нарочно повернул к тому месту. Уже мы были от него в одной только версте. К счастью попался нам Руцкий, который в то время проводив товарищей, вышедших из столицы к пану гетману, возвращался под самыми стенами Волока на свои квартиры в Рузу, где стоял с казацкою ротою. От него узнали мы, что сами идём в руки неприятелю, и поспешили воротиться. Проводнику отсекли голову, но страха нашего никто не возвратит».

А цяпер – што нам вядома пра свайго славутага земляка. Самуэль Маскевіч герба «Адравонж» нарадзіўся прыкладна ў 1580 г. у вёсцы Сэрвач Наваградскага павета і ваяводства (сёння Карэліцкі раён), паходзіў з заможнай сям'і з усходняй (рускай) часткі ВКЛ, якая асела на Наваградчыне. Яго бацька Ян Сямёнавіч Маскевіч (памёр у 1595 г.), уладальнік часткі Сэрвачы і Ятры (цяпер Валеўскі сельсавет Навагрудскага раёна), служыў у кашталяна трокскага, кальвініста Астафія Валовіча. Па ягоным прыкладзе сам стаў прыхільнікам кальвіністаў і такімі выхоўваў сваіх дзяцей – чатырох сыноў: старэйшага Яна, падсудка пінскага, Даніэля, Габрыэля і Самуэля.

(Заканчэнне будзе)

Святаслаў КРУПЕНЬКА

Кветка-папараць

(Песня пра Беларусь)

1) Давялося шукаць мне
і папараць-кветку,
І свайго жураўля
у блакіце лавіць…
Толькі б дзе я ні быў,
і зімою і ўлетку
Па старонцы адной
маё сэрца баліць.

Прыпеў:

Да маёй Беларусі
я з вандровак вярнуся,
Да бацькоўскае хаты,
дзе вяргіні гараць…
Я табой ганаруся,
за цябе я малюся
І сваю кветку-папараць
буду тут я шукаць.

2) Нібы рай гэты край –
тут і ява, і казка:
У палоне азёр залатыя гаі…
Прыязджайце у госці да нас,
калі ласка, –
У гасцях у такіх
вы яшчэ не былі.

Прыпеў.

3) Хай вяслуюць буслы
над Дзвіною і Сожам
І купаюцца зоры
у роснай траве…
І ніхто гэтак гожа
ўсміхнуцца не зможа,
Як валошка у жыце
усміхаецца мне.

Жарт тыдня ад Каласка і Калінкі

– Давай, калінка, разам жыць.

А ўдаве таксама сумна адной – пагадзілася.

Аўцюк пасадзіў парасят на самаробную каляску, павёз у новы двор.

Пажыў з удавою. Нешта загневаліся адно на аднаго. Пагрузіў аўцюк парасят у каляску, павёз дамоў.

Праз нейкі час зноў сышліся, разышліся.

Парасяты да таго прывыклі катацца, што як толькі гаспадар выпускаў іх з катушка на двор, яны беглі да каляскі.



Малая краязнаўчая энцыклапедыя

(Пачатак у № 1 за 2003 год)

МСЦІСЛА́Ў – горад, цэнтр раёна, на р. Віхра. За 95 км на ўсход ад Магілёва, 19 км ад чыгуначнай ст. Ходасы на лініі Орша – Крычаў. Вузел аўтамабільных дарог на Магілёў, Горкі, Крычаў, Чавусы, Хіславічы (Расійская Федэрацыя).

На тэрыторыі горада, на т.зв. Дзявочай Гары, выяўленае гарадзішча (сярэдзіна 1 тыс. да н.э. – I ст. н.э.). Горад узнік на Замкавай Гары («Замак»). Пры даследаванні выяўлены культурны пласт з рэчамі XII – XVII стст., драўлянымі жылымі і гаспадарчымі пабудовамі, маставымі. У цэнтры дзядзінца знойдзеныя рэшткі драўлянай вежы-данжона XVII ст. Старажытны Мсціслаў складаўся з замка, умацаванага ровам і валамі, і вакольнага горада. У летапісах Мсціслаў упамінаецца пад 1156 г. як горад Смаленскага княства. З 1180 г. цэнтр Мсціслаўскага княства. У XII – XIX стст. вядомы вытворчасцю мсціслаўскай керамікі, мсціслаўскай кафлі (XV – XVIII стст.), мсціслаўскага шкла (XVI – XIX стст.). З 2-й пал. XIV ст. у складзе Вялікага Княства Літоўскага, належаў князям мсціслаўскім. З 1528 г. ва ўладанні Жыгімонта II Аўгуста, каралеўская воласць, цэнтр староства. З 2-й пал. XVI ст. цэнтр ваяводства.

Архітэктурнае аблічча горада вызначалася дамінантамі драўлянага комплексу замка з Мікольскім храмам у цэнтры, мноствам драўляных і мураваных цэркваў, касцёлаў, кляштараў, абарончымі сценамі і вежамі пасада. Ад замка да 4 уязных драўляных брамаў – Траецкай, Афанасьеўскай, Спаскай і Папоўскай – радыяльна адыходзілі вуліцы.

У Мсціславе нарадзіўся адзін з беларускіх і рускіх першадрукароў, гравёр XVI ст. П.Ц. Мсціславец, з горада паходзіць майстар паліхромных маёлікавых рэльефаў 2-й пал. XVII ст. Сцяпан Іванаў (вядомы як Палубес). У XVI – XVII стст. вёў гандаль з гарадамі Маскоўскага княства і краінаў Зах. Еўропы. У 1634 г. атрымаў Магдэбургскае права і герб з выявай рыцарскай рукі, узброенай мячом.

У XVII – пач. XX стст. на ўскраіне горада існаваў Мсціслаўскі Тупічэўскі манастыр. Заснаваны як мужчынскі (з 1886 г. жаночы). Складаўся з Святадухаўскай, Увядзенскай, Успенскай, Мікалаеўскай цэркваў, жылых і гаспадарчых пабудоваў. Быў абнесены спачатку драўлянай, з канца XIX ст. мураванай агароджай.

У руска-польскую вайну 1654 – 1667 гг. заняты маскоўскімі войскамі (да 1661 г.). У XVII – XVIII стст. узведзеныя мураваныя кляштары: кармелітаў, езуітаў, бернардзінцаў. З 1772 г. у складзе Расійскай Імперыі, цэнтр правінцыі; з 1777 г. павятовы горад. У 1781 г. Мсціслаў атрымаў герб: на срэбным полі шчыта выява чырвонай лісіцы. У 1787 г. пабудаваны драўляны палац (згарэў у 1858 г.), на цэнтральнай плошчы створаны бульвар. У 1789 г. адкрылася народнае вучылішча. У Айчынную вайну 1812 г. горад разбураны і разрабаваны французамі.

(Заканчэнне артыкула ў наступным нумары)

Манастыр Св. Духа на малюнку сярэдзіны XIX ст.

Газета зарэгістравана ў Міністэрстве інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Рэгістрацыйнае пасведчанне № 384 ад 15 мая 2009 г. Заснавальнікі: грамадскае аб'яднанне «Беларускі фонд культуры», вытворчае прыватнае ўнітарнае прадпрыемства «Светач», Гілеп Уладзімір Аляксандравіч.

Краязнаўчая газета

Індэкс індывідуальнай падпіскі – 63320
ведамаснай – 633202

Галоўны рэдактар – Уладзімір ГІЛЕП.
Намеснік галоўнага рэдактара Уладзімір Пучынскі.
Рэдкалегія: Анатоль Бутэвіч, Навум Гальпяровіч, Анатоль Грыцкевіч, Вітольд Ермалёнак, Алесь Карлюкевіч, Людміла Кірухіна, Адам Мальдзіс, Сяргей Мітраховіч, Вячаслаў Рагойша, Павел Сапоцька, Віктар Скорабагатаў, Тадэуш Стружэцкі.

Наш адрас: 220029, г. Мінск, вул. Траецкая набярэжная, 6. Тэл. 283 28 26, 334 61 62. Тэл./факс 334-42-03 E-mail: kraga@tut.by

З-за абмежаванасці сродкаў выданне безганарарнае. Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца. Аўтары допісаў у рэдакцыю паведамляюць сваё прозвішча, імя і імя па бацьку, асноўнае месца працы, зваротны адрас. Меркаванні аўтараў могуць не адпавядаць пункту гледжання рэдакцыі. Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў. Пры перадруку спасылка на «Краязнаўчую газету» абавязковая.

Падпісана да друку: 21.11.2013
Газета надрукавана ў друкарні ТДА «Знамение» (Мінск, вул. Каржанеўскага, 14).
Ліцэнзія ЛП № 02330/0150475 ад 25.02.2009.
Заказ 1083.
Тыраж 1010 асобнікаў.